**Вынікі завочнага этапу конкурсу «Урок для дарослых як эфектыўная форма павышэння прафесійнага майстэрства настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры»**

У адпаведнасці з Рэспубліканскім каардынацыйным планам мерапрыемстваў дадатковай адукацыі педагагічных работнікаў на 2019 год дзяржаўная ўстанова адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі» праводзіць конкурс метадычных распрацовак метадыстаў раённых (гарадскіх) вучэбна-метадычных кабінетаў і настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры «Урок для дарослых як эфектыўная форма павышэння прафесійнага майстэрства настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры» (красавік-кастрычнік 2019 года).

У завочным этапе конкурсу прынялі ўдзел 9 настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры. Згодна з рашэннем журы фіналістамі, якія 17.10.2019 ў вочным фармаце прадставяць свае распрацоўкі ў межах выніковага мерапрыемства конкурсу, сталі:

1) ***Белавус Святлана Іванаўна***, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай ўстановы адукацыі «Сярэдняя школа № 3 г.Століна»;
2) ***Жгарова Валянціна Мікалаеўна***, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Камунараўская сярэдняя школа Буда-Кашалёўскага раёна»;
3) ***Казачэнка Ірына Рыгораўна***, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Лельчыцкая раённая гімназія»;
4) ***Сякацкая Любоў Віктараўна***, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 2 г. Оршы».

Астатнія ўдзельнікі завочнага этапу конкурсу, а менавіта:

*1) Аганоўская Таццяна Расціславаўна, дырэктар, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Валеўскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа» (Навагрудскі раён);*

*2) Адзіянава Ірына Алегаўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 21 г. Магілёва»;*

*3) Лічэўскі Павел Іванавіч, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія №1 імя Ф. Я. Перца г. Пінска»;*

*4) Мацкель Наталія Іосіфаўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры дзяржаўнай установы адукацыі «Сольская сярэдняя школа»* (Смаргонскі раён)*;*

*5) Пашкевіч Галіна Фёдараўна, настаўнік беларускай мовы і літаратуры ўстановы адукацыі «Столінская дзяржаўная гімназія»*

запрашаюцца на выніковае мерапрыемства ў якасці слухачоў, якія змогуць больш глыбока пазнаёміцца з урокам для дарослых, прыняць удзел (у ролі «вучняў») у правядзенні ўрокаў для дарослых, што паводле рашэння журы выйшлі ў фінал, падзяліцца сваім вопытам.

Дадатковую інфармацыю па ўсіх пытаннях, звязаных з правядзеннем выніковага мерапрыемства конкурсу «Урок для дарослых як эфектыўная форма павышэння прафесійнага майстэрства настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры», можна атрымаць па тэлефоне 80172966994 (Акушэвіч Андрэй Аляксандравіч).


Акушэвіч А. А.,
метадыст вышэйшай катэгорыі
ўпраўлення вучэбна-метадычнай работы
дзяржаўнай установы адукацыі
«Акадэмія паслядыпломанй адукацыі»